Аўтар: Рэдакцыя
06.03.2011 03:00



1993 г. Пілігрынацыя абраза Будслаўскай Божай Маці ў Гродзенскай дыяцэзіі. Вернікі паасобных парафій дыяцэзіі адаравалі суткі абраз Божай Маці.

10 ліпеня 1993 г. адбылося асвячэнне касцёла св. Альжбеты Венгерскай і Божай Міласэрнасці ў Падароску. Яго асвяціў кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч.

8 снежня 1994 г. У гродзенскай катэдры кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў дыяканскія пасвячэнні клерыкам: Юзафу Станеўскаму, Андрэю Бародзічу, Юзафу Ганьчыцу, Яну Крэмісу, Антонію Клімантовічу.

14 снежня 1994 г. У Гродзенскай катэдры адбылося ўрачыстае ўвядзенне кс. кардынала Казіміра Свёнтэка. Ва ўрачыстай св. Імшы прынялі ўдзел таксама арцыбіскуп Агастына Маркета, апостальскі нунцый у Беларусі, і кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч.

9 красавіка 1995 г. У Лідзе адбыўся дыяцэзіяльны Дзень моладзі, падчас якога ўпершыню выступіў семінарыйны ансамбль “Ave”.

17 чэрвеня 1995 г. Ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч упершыню ўдзяліў святарскія пасвячэнні выпускнікам ВДС у Гродне. Святарскія пасвячэнні прынялі дыяканы Юзаф Станеўскі і Юзаф Ганьчыц.